Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Палескі дзяржаўны ўніверсітэт”

ПолесГУ

**М.В. Цуба**

# Палескія пуцявіны Аляксандра Блока

***(Да 100-годдзя службы Аляксандра Блока на Палессі падчас Першай сусветнай вайны)***

Пінск
ПалесДУ
2018

УДК 930(476)
ББК 63.3(4Беи)62
Ц83

Р э ц э н з е н т ы:
доктар філалагічных навук, прафессар Ненадавец А.М.;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гагуа Р.Б.

Р э к а м е н д а в а н а
да друку навукова-метадычным саветам
УА “Палескі дзяржаўны ўнверсітэт”

**Цуба, М.В.**

Ц83 Палескія пуцявіны Аляксандра Блока / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2018. – 38 с.

ISBN 978-985-516-513-3

Аўтар: Цуба Міхаіл Віктаравіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны УА “Палескі дзяржаўны ўніверсітэт”.

У кнізе апавядаецца пра ваенную службу знакамітага расійскага паэта Аляксандра Блока на Палессі падчас Першай сусветнай вайны. Прыводзяцца цікавыя малавядомыя звесткі і факты пра яго знаходжанні на беларускай зямлі.

УДК 930(476)
ББК 63.3(4Беи)62

ISBN 978-985-516-513-3

© Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

ПолесГУ

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................ 4
1. АЛЯКСАНДР БЛОК У ПЕРШЫЯ ГАДЫ ВАЕННАГА ЛІХАЛЕЦЦЯ ........................................................................ 9
2. ПАЛЕСКІЯ ШЛЯХІ АЛЯКСАНДРА БЛОКА ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ........................................ 13
3. ПАМЯЦЬ АБ АЛЯКСАНДРУ БЛОКУ ЖЫВЕ НА ПАЛЕССІ ........................................................................ 23
ЛІТАРАТУРА ........................................................................ 31
ДАДАТКІ-ВЕРШЫ, ПРЫСВЕЧАННЫЯ МЕСЦАЗНАХОДЖАННЮ А.А. БЛОКА НА ПАЛЕССІ ...... 33

ПолесГУ

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне біяграфіі вядомых асоб, асвятленне абставін іхняга жыцця на беларускіх землях у лёсавазначальны перыяд Першай сусветнай вайны з’яўляецца адной з актуальных праблем і ў наш час. Абумоўленна гэта ўзрастаючым інтарэсам беларусаў да пазнання гісторыі свайго краю, да даследавання дейнасці тых знакамітых пісьменікаў, паэтаў шляхі якіх праляглі праз нашу Радзіму.

Адной з такіх асоб з’яўляецца славуты расійскі паэт Аляксандр Аляксандравіч Блок. Аляксандр Блок пражыў кароткае жыццё (1880–1921), але яго творчасць яскрава адлюстроўвала падзеі складанага перыяду першай чвэрці XX ст. Спачатку расійска-японская вайна, затым першая расійская рэвалюцыя, потым Першая сусветная вайна ў кантэксце з лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцыямі. Гэтыя падзеі істотна паўплывалі на лёс паэта, які ў паэме “Двенадцать” пісаў:

Испепеляющие годы!
Безумья ль в вас, надежды ль весть?
От дней войны, от дней свободы –
Кровавый отсвет в лицах есть…

Большасць літаратуразнаўцаў адносяць паэзію Аляксандра Блока даваеннай пары да сімвалічнага стылю. Аднак падчас Першай сусветнай вайны Блок нечакана разбурае ўсе рамкі, ў якія ўпісвалася яго творчасть, і ўяўляе нам своеасаблівы воблік – пачынальніка новай літаратуры, новай гісторыка-рэвалюцыйнай паэзіі. Менавіта, перыяд знаходжання паэта на беларускіх землях, яго жыццё на Палессі шмат у чым пасадзейнічалі таму, што Блок перайшоў да новых, наватарскіх накірункаў паэзіі, якія адпавядалі часу.

Бяспрэчна, што творчасць і жыццёвы шлях Аляксандра Блока прыцягвалі і прыцягваюць па цяперашні дзень да сябе ўвагу вялікай колькасці журналістаў, даследчыкаў, гісторыкаў-краязнаўцаў, грамадскасці не толькі на тэрыторыі Расійскай Фэдэрацыі, але і ў нашай краіне. Нягледзячы на

Полесгу

тое, што час знаходжання Блока на Палессі вывучаны значна горш і слабей, чым яго жыццё ў іншых рэгіёнах Расіі, тым не менш ёсць літаратура, якая ў пэўнай ступені адлюстроўвае дадзены перыяд. Як прыклад можна прывесці нарыс М. Калінковіча "Палескія дні Аляксандра Блока" [1], але гэтая праца напісана ў чыста мастацкім жанры і не мае даследчыцкага характару. Іншыя аўтары артыкулаў аб Блоку (В. Гришковец "Смятенная муза молчала" [2], І. Бас "Аляксандр Блок на Палессі" [3]) лічаць, што паэт на Палессі паглыбіўся ў стан пачуццёвага бязвыхаднага крызісу, што прывяло да працяглага творчага бяссілля.

Па-ранейшаму ў публікацыях прыводзяцца некаторыя супярэчлівыя дадзеныя, маецца блытаніна, прысутнічае недакладнасць. Напрыклад, аўтары кнігі "Дорогами дружбы" (Мінск, 1985, с. 96–98), а таксама артыкула "Блок на Полесье" [4, с. 172], І. Пірожнік, В. Аношка, С. Кот пішуць, што зямлі беларускага Палесся Блок прысвяціў наступныя радкі:

Полюби эту вечность болот:
Никогда не иссякнет их мощь.
Этот злак, что сгорел – никогда не умрет,
Этот куст – без истления – тощ.

Хаця вядома (і гэта няцяжка праверыць), што вышэй працытаваны верш быў напісаны паэтам яшчэ ў 1905 г., а ўпершыню Палессе ён наведаў у гады Першай сусветнай вайны.

Усе гэтыя праблемы патрабуюць неабходнасці ўсебаковага, комплекснага даследавання, дасканалага вывучэння жыццядзейнасці Аляксандра Блока ў нашым краі. Такі разгляд дапаможа больш поўна вызначыць ролю расійскага паэта ў гісторыі не толькі расійскай, але і беларускай літаратуры і культуры.

**Актуальнасць і выбар тэмы даследавання абумоўлены наступнымі высновамі:**

Актуальнасць праблемы вызначана неабходнасцю стварыць максімальна аб'ектыўную карціну знаходжання і



ПолесГУ

жыццядзейнасці расійскага паэта Аляксандра Блока на Палессі падчас Першай сусветнай вайны (ліпень 1916 – сакавік 1917 гг.). Гэта абумоўлена павышанай цікавасцю жыхароў палескага краю да сваёй гістарычнай спадчыны, да тых людзей, якія лёсам былі звязаны з Палессем і ўнеслі істотны плён у скарбніцу сусветнай культуры і, тым самым, адыгралі канструктыўную ролю ў нашай гісторыі.

Акрамя таго, такога разгляду патрабуюць працэсы станаўлення Саюзнай беларуска-расійскай дзяржавы і дэмакратычнага абнаўлення, якія маюць месца сёння ў нашай краіне. Менавіта гэтыя працэсы спарадзілі інтарэс да беларуска-расійскіх адносін, культурных сувязяў, што можа пасадзейнічаць турыстычнай прываблівасці музея Аляксандра Блока ў вёсцы Лапаціна для грамадзян Расійскай Федэрацыі, а таксама абавязкова заахвоціць іх наведаць іншыя мясціны, звязанныя з прозвішчам Блока на нашай палескай зямлі.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляюцца найбольш цікавыя, малавядомыя старонкі жыцця і дзейнасці Аляксандра Блока на Палессі ў перыяд Першай сусветнай вайны.

**Прадмет даследавання** – жыццё і лёс паэта Аляксандра Блока ў спалучэнні з франтавымі, ваеннымі ўмовамі той рэчаіснасці, у якой ён знаходзіўся ў палескім краі.

**Гіпотэза даследавання** – выкананне сваіх грамадзянскіх абавязкаў, што былі наканаваны лёсам, паэтам Аляксандрам Блокам у гады страшнага ваеннага ліхалецця на зямлі беларускага Палесся, яго праца, адносіны да людзей, захапленне мясцовай прыродай, цікавасць да палітыкі, рэвалюцыйных настрояў, перамены ва ўсведамленні. У выніку, паэт прыналежны да дваранскай інтэлігенцыі, які пачаў разумець гістарычную бесперспектыўнасць свайго саслоўя, перайшоў на бок рэвалюцыйнага народу, тым самым кардынальна змяніў і тэмы сваёй паэтычнай творчасці.

Улічваючы наспелую актуальнасць з аднаго боку, а з другога – недастатковую распрацаванасць і пэўную

ПолесГУ

памылковасць меркаванняў аналізуемай тэматыкі, у працы пастаўлена наступная **мэта**: на аснове вывучанай літаратуры, перыёдыкі, архіўных і дакументальных крыніц, расказаў людзей, якія тым ці іншым чынам звязаны з блоказнаўствам – правесці комплекснае, align="center"рознабаковае, аб’ектыўнае даследаванне і творчасці расійскага паэта Аляксандра Блока на землях беларускага Палесся падчас Першай сусветнай вайны.

Зыходзячы з мэты, вызначаны наступныя **задачы даследавання:**

– высвятліць абставіны і ахарактарызаваць грамадзянскую пазіцыю Аляксандра Блока ў першыя гады ваеннага ліхалецця;

– вывучыць жыццядзейнасць Аляксандра Блока на Палессі, паказаць як вайна і звязанныя з ёй падзеі паўплывалі на ўсведамленне і змены настрою паэта;

– прааналізаваць успаміны Блока аб часе, праведзенным на Палессі, а таксама яго след, што застаўся на нашай зямлі. Раскрыць ушанаванне памяці аб паэце ў нашым краі.

Для рэалізацыі пастаўленных мэты і задач выкарыстаны наступныя **метады даследавання**: праводзіўся метад аналізу і вывучэння літаратуры.

Прымяняўся *параўнальна-гістарычны метад*: занатаваныя запісы ўспамінаў аб Блоку і расказы блоказнаўцаў параўноўваліся і ўдакладняліся ў ходзе абагульнення гістарычнай і філалагічнай літаратуры, перыядычнага друку, дакументальных матэрыялаў, архіўных дадзеных Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Беларускага Дзяржаўнага архіву-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ), а таксама праводзілася фатаздымачная праца. Акрамя таго, у рабоце выкарыстаны матэрыялы, дакументы, экспанаты з літаратурнага музея імя А.А. Блока, што знаходзіцца ў вёсцы Лапаціна.

**Навуковая навізна працы** заключаецца ў тым, што дадзеная работа з’яўляецца самастойным даследаваннем

малавядомых старонак жыцця Аляксандра Блока на Палессі падчас Першай сусветнай вайны.

У выніку атрыманы новыя дадзеныя, сфармуляваны вывады, якія ўтрымліваюць пэўную даследчую навізну, дапаўняюць і ў істотнай ступені мяняюць ранейшыя погляды на жыццё і дзейнасць Аляксандра Блока падчас яго знаходжання на палескай зямлі.

**Практычная значнасць:** высновы і новыя факты могуць быць выкарыстаны пры правядзенні школьных факультатыўных заняткаў, афармленні экспазіцый, выстаў у бібліятэках, школьных музеях, пры правядзенні мерапрыемстваў культурна-патрыятычнага характару.

**Структура і аб'ём працы:** навукова-даследчая праца складаецца з уводзін, трох раздзелаў, паслядоўна адлюстроўваючых логіку даследавання, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры (уключаючы крыніцы) і дадаткаў. Поўны аб'ём працы – 29 старонак.

ПолесГУ

# 1. АЛЯКСАНДР БЛОК У ПЕРШЫЯ ГАДЫ ВАЕННАГА ЛІХАЛЕЦЦЯ

Пачатак Першай сусветнай вайны застаў Аляксандра Блока ў Санкт-Пецярбургу. Амаль ва ўсіх дзяржавах пачатак “Вялікай вайны” быў сустрэты з уздымам і энтузіязмам. Не стала выключэннем і Расійская імперыя.

Ужо ў першы дзень вайны была перайменавана сталіца расійскай дзяржавы (Санкт-Пецярбург страціў сваю нямецкую назву і стаў Петраградам). 2 жніўня велізарныя натоўпы народа віталі Мікалая II на дварцовай плошчы сталіцы. У гэты дзень імператар пакляўся на Евангеллі і святой іконе, што не падпіша міра, пакуль хоць адзін вораг застанецца на рускай зямлі. Вядома, што тысячы людзей – прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства, у адзіным парыве стоячы на каленях перад Мікалаем II спявалі гімн “Боже, царя храни”.

Такія ж настроі панавалі і ў Дзяржаўнай думе. Дэпутаты амаль аднагалосна (за выключэннем сацыял-дэмакратаў) прынялі рашэнне аб крэдытах на ваенныя патрэбы.

Рабочыя па ўсёй краіне спынілі забастоўкі і першыя мабілізацыйныя наборы прайшлі ў поўным парадку. Народныя настроі ў тыя дні набылі яўную антынямецкую накіраванасць. Дэманстранты разграмілі германскую амбасаду. Гарэлі падпаленыя гуртам будынкі нямецкіх фірм. Пражываючым у Расійскай імперыі, ў тым ліку на беларускіх землях, немцам і іх сем’ям з першых дзён вайны прыйшлося выцярпець нямала зняваг і іншых праяў варожасці [5, с. 65–66].

Паводле афіцыйнай прапаганды вайна лічылася справядлівай, нават “Вялікай Айчыннай”, а насельніцтва заклікалася ўсімі магчымымі сродкамі аказваць падтрымку і неабходную дапамогу ў мэтах дасягнення хутчэйшай перамогі над ворагам.

У распаўсюджаным па Петраграду вазванні падкрэслівалася, што “Для Расіі наступілі цяжкія дні. Мільёны верных яе сыноў гатовы абараняць сваімі грудзьмі Айчыну і

Палессу

ахвяраваць радзі яе жыццём. У такі час кожны, хто любіць Радзіму павінен думаць толькі аб тым, як дапамагчы Дзяржаўнаму манарху і яго доблеснай арміі ў барацьбе з ворагам" [6].

У гэтай сувязі становіцца зразумелай тая атмасфера патрыятычнага энтузіязму, ахапіўшая слаі грамадскасці Расійскай імперыі.

Але адносіны Аляксандра Блока да дадзеных падзей кардынальна адрозніваліся. Як паэт-сімваліст, ён у глыбіні душы прадбачыў і адчуваў тыя вялікія беды, якія можа прынесці вайна ўсім народам, успрымаў сусветную бойню як жудасную нечалавечую праяву. У гэты час, маючы славу лепшага паэта Расіі, ён з глыбокім смуткам рэагаваў на пачатак вайны, імкнуўся пазбегнуць мабілізацыі на фронт. Не таму, што адчуваў сябе баязліўцам, а таму, што вайна яму бачылася з'явай антынароднай. І ў адрозненне ад многіх вядомых тагачасных пісьменнікаў і паэтаў Аляксандр Блок быў свабодны ад шавіністычнага ўгару і псеўдапатрыятызму [4, с. 134].



*Пачатак Першай сусветнай вайны. Мабілізацыя у Петраградзе,1914 г.*

На пачатку вайны паэт, як бы прыадчыняючы жудасную будучыню, піша шэраг вершаў, прысвечаных ваенным падзеям гэтага часу. У выніку з-пад яго пяра выходзяць наступныя творы антываеннай накіраванасці: «На войну уходил эшелон», «Петроградское небо мутилось дождем»,

«Наполнял за вагоном вагон», «Без конца – взвод за взводом и штык за штыком».

Вайна з самага пачатку закранула паэта. Ужо ў 1914 г. міласэрнай сястрой у шпіталі пачала працаваць яго жонка – Любоў Дзмітрыеўна. Захварэла на тыф і памерла ў 25-гадовым узросце яго зводная сястра – Ангеліна Блок [1, с. 8].

З цягам часу ранейшыя пераможныя маршы змяніліся на расчараванні, а вайна прывяла да паражэнняў, разбурэнняў і гаспадарчай разрухі.

Менавіта ў гэты самы цяжкі перыяд вайны для Расійскай імперыі Блок, які быў ахоплены трывожнымі думкамі пра лёс Радзімы, дае згоду на мабілізацыю ў дзеячую армію. Маці паэта – Аляксандра Бекетава, хвалюючыся за лёс сына, напісала знаёмай Блока, вядомай спявачцы Л.А. Дэльмас наступнае пасланне: “Мне прапанавалі ўсталяваць яго тут, але ён сам пажадаў ехаць на фронт...



*Л.Д.Блок – сястра міласерднасці*




*Л.А.Дэльмас*

Калі я або Люба (жонка паэта) прапаноўвалі яму знайсці месца больш зручнае і менш небяспечнае (ён едзе ў балотныя мясціны), ён так страшна злаваўся на нас і мы адступілі. Ён так вырашыў і патрэбна з гэтым мірыцца. Ён будзе займаць інжынерную пасаду, якая не патрабуе тэхнічнай адукацыі” [7]. У сваю чаргу Аляксандр Блок, атрымаўшы павестку,

ПолесГУ

піша да маці ў Шахматава натупнае: “Сёння я, як ты ведаеш, прызваны. Разам з тым я ўжо сёння залічаны ў арганізацыю Земскіх і гарадскіх саюзаў: званне маё – “табельшчык 13 інжынерна-будаўнічай дружыны”, якая займаецца ўмацаваннямі абарончай паласы; абавязкі – прыкладна – улік працы чарнарабочых; форма – амаль афіцэрская – з корцікам, на днях яе апрану. Буду на афіцэрскай пасадзе каля лініі фронта”[7]. Такім чынам, ў ліпені 1916 г. сам паэт быў залічаны табельшчыкам 13 інжынерна-будаўнічай дружыны Усерасійскага саюза зямель і гарадоў, якая пачала фарміравацца на Заходнім фронце ў раёне пінскіх балот [8, с. 67].

Выехаўшы з Петраграда Аляксандр Блок, наведаў апошні раз у жыцці свае любімае Шахматава. Менавіта тут, ахоплены пачуццямі адчаяння перад невядомай будучыняй, ён піша апошні свой верш перад выездам у Беларусь, а затым ужо напрацягу 7 месяцаў яго ліра змоўкла.

Превратила все в шутку сначала,
Поняла – принялась укорять,
Головою красивой качала,
Стала слезы платком вытирать.

Что ж, пора приниматься за дело,
За старинное дело свое,–
Неужели и жизнь отшумела,
Отшумела, как платье твое?

Пакінуў Шахматава Аляксандр Блок раніцай 27 ліпеня 1916 г. Далейшы шлях яго ляжаў праз Оршу, Магілёў, Жлобін, Гомель.

Такім чынам, зацягнуўшаяся вайна, паражэнні на фронце, гаспадарчая разруха, палітычны крызіс у вярхах улады наглядна сведчылі аб няздольнасці самадзяржаўя палепшыць становішча ў краіне. У выніку бедствы, звязаныя з вайной, аказалі эмацыянальнае ўздзеянне на Аляксандра Блока і ён, каб лепш разабрацца ў сітуацыі, і быць у эпіцэнтры падзей дае згоду на мабілізацыю ў дзеючую армію.

ПолесГУ

## 2. ПАЛЕСКІЯ ШЛЯХІ АЛЯКСАНДРА БЛОКА ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

28 ліпеня паэт прыехаў у Гомель, дзе правёў суткі на размеркавальным пункце, а затым быў накіраваны бліжэй да фронту. У ходзе паездкі яму ўпершыню давялося сысці на палескай чыгуначнай станцыі Лунінец, а потым ён быў накіраваны ў штаб 13 інжынерна-будаўнічай дружыны, які знаходзіўся ў Парахонску [9, с. 3].

На шляху да месца назначэння Аляксандр Блок не трапляе адразу ў Парахонск, а сыходзіць на станцыі Лоўча. Адсюль накіроўваецца ў вёску Камень Пінскага павета. Аб гэтым ён сам паведамляе жонцы ў пісьме ад 7 жніўня 1916 г.: "У вёсцы Камень, куды я прыехаў на мяшках з мукою па вузкакалейцы з Лоўчы, я пражыў усяго 2 дні..." [2, с. 13]. Затым разам са штабам паэт пераехаў у вёску Парахонск, дзе знаходзілася найбліжэйшая да фронту чыгуначная станцыя.

У дружыне паэт выконваў даволі сціплую ролю. Ён быў табельшчыкам з месячным акладам у сто рублёў. Абавязкі не абцяжарвалі Аляксандра Блока. Паэт быў прывычны да цяжкасцяў і валодаў здольнасцямі да ўсялякай фізічнай працы. Блок прымаў і размяркоўваў на ўчастках рабочых, якія прыбывалі на Палессе з Сярэдняй Азіі, Паволжа, Украіны, далёкага Усходу, з розных куткоў Беларусі, даваў нарады і распараджэнні, пісаў справаздачы.

Але ж такі накірунак жыцця не казаўся для Блока занадта цяжкім. "…Мы тут жывём атрадам – вельмі прымітыўна, але добра і дружна, – піша ён у чарговым пісьме. – З балота паблізу ад нас можна бачыць горад, які заняты праціўнікам, вакол стаяць войскі. Увогуле ж балоты зусім не такія, як іх уяўляеш сабе, – на розным узроўні, не суцэльныя, часткова сухія" [7].

Са сваімі таварышамі па службе ў паэта былі добрыя стасункі, хаця ён не прыдаваў асабліва вялікага значэння адносінам з калегамі па рабоце ў дружыне. Пасля працы ў вольны час любіў гуляць ў шахматы, купацца ў рэчцы. Яму вельмі падабаліся беларускія народныя песні, якія часта

ПолесГУ

можна было тут пачуць вечарамі. Аднак бадзёры і вясёлы настрой Блока быў незаўсёды. Бывала, што ён мог паскардзіцца на сум альбо адзіноту.

Абставіны, у якіх апынууўся паэт, упершыню ў сваім жыцці, не маглі не адбіцца на светапоглядзе гэтага неардынарнага чалавека, а ў дальнейшым і на яго творчасці. Знаходжанне Блока на Палессі садзейнічала яго збліжэнню з простым народам, давала магчымасць глыбей убачыць іх жыццё, вастрэй усвядоміць неабходнасць хутчэйшых сацыяльных пераўтварэнняў у краіне. Мець такую цесную сувязь з разнахарактарнай па сваім складзе масай людзей Блоку яшчэ ніколі не даводзілася. Падчас шматлікіх паездак у атрады яму прыходзілася спаць з рабочымі ў адным памяшкані, слухаць іх размовы пра жыццё, вайну, становішча ў тыле, а таксама працяглы час жыць у сялянскіх хатах. Наглядаць як наступствы ваеннаяй калатнечы давялі палескія вёскі да поўнага разарэння, да крайняй ступені жабрацтва.

Няма сумневу, што ў яго дапытлівым усведамленні ўспрымалася і акумуліравалася ўсё тое, што яго атачала. А гэта – сотні рабочых у дружыне розных нацыянальнасцяў з сваімі характарамі і патрабаваннямі. Гэта – салдаты на пазіцыях са сваімі меркаваннямі і настроем. Гэта – сяляне ў палескіх вёсках са сваімі клопатамі і турботамі. Акрамя таго не абыходзілася і без народнага фальклору – песен, частушак, прымавак, вострых выказванняў, а таксама прываблівала паэта незвычайная прыгажосць прыроды Палесся. Усе пералічанае – гэта тыя складаючыя, якія затым выльюцца ў чаканныя ямбы новай паэмы “Возмездие”, бяспрэчна, тут недзе знаходзяцца і крыніцы паэм “Двенадцать” і “Скифы”.



Полесгу





*Аляксандр Блок і Максім Гарэцкі у Парахонску, 1916 г.*

У Парахонску і прайшла большая частка з тых 200 дзён, што Блок правёў на Палессі. Вядома, што ў гэты час у дадзенай вёсцы таксама служыў вядомы беларускі пісьменнік Максім Гарэцкі. Але ці перасякаліся хоць нейкім чынам шляхі-дарогі беларускага і расійскага класікаў літаратуры на Піншчыне застаецца невядомым. Тым не менш, ёсць звесткі, што ў Парахонску, а таксама ў некаторых іншых прыфрантавых населеных пунктах, сяляне звярталіся з хадатайніцтвам да кіраўніцтва Усерасійскага саюза зямель і гарадоў з мэтай адкрыцця народных школ. У такіх зваротах падкрэслівалася, што “Школа і пісьменнасць неабходныя ім і іх дзецям як важнейшы сродак пазбаўлення ад цемнаты і невуцтва, як найпершая жыццёвая патрэба”[10]. Магчыма, што ў Парахонску падобныя звароты ажыццяўляліся дзякуючы становчым адносінам да гэтай справы як Блока, так і Гарэцкага. Жыў паэт у фальварку князя Друцкага-Любецкага. Менавіта тут, у Парахонску Аляксандр Блок сустрэў сваё 36-годдзе. Тую палову жыцця, якая па яго меркаваннях была “самая цяжкая”. Вядома, што з гэтай

Полесі

нагоды ў княжацкім доме адбылася святочная ўрачыстасць. Дзень нараджэння Блок адзначыў разам са сваімі таварышамі па дружыне. Але застолле не прынесла паэту задавальнення. У дзённіку Блок адзначыць, што яго думкі ў гэты час былі аб лёсе Радзімы і старасці, якая паступова набліжалася [7].

Побач з фальваркам працякала рака Бобрык, у якой паэт часта купаўся. З-пад Пінска даносілася кананада – там ішлі баі. Калі зараз спыніцца на мосце цераз Прыпяць, дзе ў той час праходзіла пярэдняя лінія фронту, то можна ўбачыць Пінск вачыма Блока. У пісьме да жонкі ён пісаў: "З поля віднееца Пінск, падобны граду Кіцежу, прыўзняты над туманам: белы сабор, чырвоны касцёл, а пасярэдзіне – меншае – семінарыя. Балот шмат" [11, с. 4].

11 жніўня 1916 г. у складзе інжынерна-будаўнічага атрада паэт быў накіраваны ў вёскі Лапаціна і Калбы, дзе вялося будаўніцтва запасных пазіцый для расійскіх войск і



*Аляксандр Блок са сваімі таварышамі*

дзе ён прабыў да канца.

У Калбах Аляксандр Блок пасяліўся ў хаце Лемяшэўскіх разам са сваімі таварышамі Паповым, Ідэльсонам, Глінкам, Ігнацьевым і Ягоравым. Аб чым ён піша ў пісьме да жонкі Любові Дзмітрыеўны Блок-Мендзялеевай ад 16 жніўня 1916 г. з вёскі Калбы Пінскага павета: "Жывём ў вёсцы ў добрай хаце – даволі дружна і весела (Ідэльсон, прысяжны паверан, Ягораў, сын прафесара, Папоў, студэнт, Глінка, праўнук кампазітара, Ігнацьеў і я)". Акрамя таго, у другіх

сваіх запісах Блок успамінае і аб іншых сваіх таварышах па дружыне: Катоніне, Фёдараве, Кнілгаўзене, Зайцаве, Цыганове, Пратасовічы, Шлыкаве, Пршэдпельскім, Лукашэвічы [7]. Пра жыццё ў хаце Лемяшэўскіх Блок паведамляе і ў пісьме ад 21 жніўня да маці: "Уладкаваліся даволі добра. У хаце 3 пакоі... у адным з іх жывуць Папоў, Ідэльсон і Глінка, у другім – Ігнацьеў, Ягораў і я, у трэццім – гаспадар з гаспадыняй, на гарышчы – 2 мілавідныя дзяўчыны..." [12, с. 30]. У яго абавязкі табельшчыка, а затым загадчыка аддзела ўваходзіла многае: прымаць і размяшчыць рабочых, якія прыбывалі з усіх куткоў краіны, весці ўлік работ, ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва [6, с. 67].

Дружына Блока праводзіла ў раёне Пінска дарожныя работы, капала акопы, будавала фартыфікацыйныя ўмацаванні.



*А.А. Блок (злева) ля хаты Лемяшэўскіх у в.Калбы, побач з паэтам начальнік 1-га атрада Я.В. Лукашэвіч*

У час шматлікіх паездак у атрады, размешчаныя за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад асноўнай базы, паэту прыходзілася спаць з рабочымі ў адным памяшканні, слухаць іх размовы аб жыцці, аб вайне, аб становішчы ў тыле [3, с. 155]. Трэба думаць, што Блок добра быў знаёмы з

настроямі гэтых людзей, іх нянавісцю да самадзяржаўя, жаданнем хутчэй пакончыць з кровапралітнай вайной.

Аб чым Блок успамінае: “На рацэ побач працуе землечарпалка, наш штаб жадае набыць кацер для дастаўкі нам прадуктаў падчас бездарожжа. Тэлефон, як звычайна, сапсаваны. Начальнік страшна злуецца і вельмі шмат пагражае камендатурай, расстрэламі, павешаннем, катаргай і інш. На шчасце (а можа быць і дарэмна), не выконвае.

Бліжэй да вечара, калі пачынаецца размова аб тым, сколькі хто выкінуў кубаў зямлі, сколькі выкапана ячэяк і траверсаў, ад чаго сапёры запавольваюць з трасіроўкай і інш., усе ўжо вельмі хочуць спаць, нават і начальнік бывае; а ўвогуле ён можа ў любую хвіліну ночы напісаць пропуск альбо аблаяць дачнікаў. Камітэты, якія накіроўваюць нам рабочых, часта прысылаюць хворых на пранцы, бязрукіх, так што бывае прыходзіцца тэрмінова адсылаць іх назад” [13, с. 269, 270].

У дружыне Аляксандра Блока было шмат беларусаў, якіх ў прымусовым парадку заганялі на ваенна-будаўнічыя работы. Па абавязковай пастанове, выдадзенай у жніўні 1916 г. начальнікам Мінскай ваеннай акругі, куды ўваходзіла і Піншчына: “Бежанцы, а таксама сяляне прыфрантавых паветаў і іншыя асобы абодвух палоў ад 15 да 50 гадоў павінны прыцягвацца да работ, звязаных з патрэбамі арміі” [14]. Ненавідзячы царскія ўлады і вайну, рабочыя часта кідалі працу, уцякаючы дамоў. У адным з пісьмаў паэт паведамляе, што рабочы дзень яго пачынаецца з высвятлення, хто знаходзіцца ў бегах. Зразумела, што цэнзурныя ўмовы не дазвалялі Блоку падрабязна пісаць пра тое, што рабілася ў дружыне і тым больш – у вайсковых фарміраваннях, размешчаных у прыфрантавым Палессі. Аднак асобныя намёкі, якія сустракаюцца ў яго пісьмах да маці, гавораць шмат пра што. Напрыклад, у адным з такіх пісьмаў ад 4 лістапада 1916 г. паэт адзначае, што ў дружыну прысланы “для парадку” казакі [3, с. 155].



ПолесГУ

Няцяжка здагадацца, што за гэтым паведамленнем хаваюцца такія канкрэтныя падзеі, як непадпарадкаванне начальству, уцёкі, антываенныя выступленні і г.д.

У вёсцы Калбы Блок правёў паўмесяца – з 14 жніўня па 3 верасня. Разам з таварышамі па дружыне ён прымае непасрэдны ўдзел у будаўніцтве запасных пазіцый па лініі Камень – Сошна – Лапаціна агульнай працягласцю каля 50 км.

Па звестках, занатаваных Блокам, пазначаецца, што "на ўсіх дарогах знаходзяцца дазоры, праязжаюць веставыя, патрулі, ва ўсіх вёсках і фальварках стаяць войскі. Палова вёскі Калбы заселена нашымі 300-мі рабочымі: туркестанцамі, уфімцамі, разанцамі, сахалінцамі з катаргі, масквічамі (усіх горш і ўсіх нахабней), пецярбургскімі, русінамі. З раніцы высвятляецца, сколькі куды пайшло, хто звяртаецца да доктара, каму што выдаваць з каморы. Работы вяліся ўручную, усімі 300-мі рабочымі, большая палова з якіх, як адзначаў Блок, калекі і проста непрацаздольныя рэзервісты" [2, с. 13]. З золку і да самага вечара паэт знаходзіўся на ўчастку работ, моцна стамляўся, але да службовых абавязкаў адносіўся добрасумленна, даручаную працу выконваў своечасова, за ўсё браўся з уласцівым яму азартам. Ён лічыў, што галоўнае – гэта арганізаванасць, а таксама чуласць і ўважлівасць, сабранасць і патрабавальнасць да сябе і падпарадкаваных. Запісы ў дзённіку і пісьмы Блока гэтага часу сведчаць аб рэзкай перамене светапогляду і, асабліва, характару паэта. Усё напісаннае ў дадзены перыяд і блізка не стасуецца з манерамі вытанчанага, далікатнага паэта-сімваліста і адпаведна прадстаўніка пецярбуржскай багемы, а зусім іншага Блока, які ў сухім, сціплым змесце паведамляе маці, што ў яго абавязкі ўваходзяць "…падтрыманне вызначанага парадку, нагляд за жылымі пабудовамі, забеспячэнне падначаляннных харчаваннем, правільнасцю ўліку і запісу заробка ў разліковых кніжках, разбор скарг і непаразуменняў паміж рабочымі…" [15, с. 195].

Полесгу

Аляксандру Блоку прыходзілася шмат ездзіць па Палессю. Па доўгу службы ён пабываў у такіх населеных пунктах, як Лунінец, Лунін, Лобча, Камень, Селішча, Лапаціна, Калбы, Новы Двор, Маладзельчыцы, Вылазы, Пагост, Чорнава і інш. У яго пісьмах і ў дзённіку часта сустракаюцца запісы: “Праехаў вярхом верст 20 і ў грузавым аўтамабілі вёрст 80” (7 жніўня 1916 г.), “... без канца ездзілі на конях па снежных лясах і раўнінах” (14 лютага 1917 г.) і г.д. [3, с. 156]. Такім чынам, ён знаёміўся са становішчам мірнага беларускага насельніцтва прыфрантавой паласы. Упершыню прыходзілася Блоку назіраць жыццё, быт беларусаў, прыглядацца да іх звычаяў. Зносіны з простымі людзьмі расшыралі сацыяльны кругагляд паэта, узбагачалі яго жыццёвыя назіранні, прымушалі задумвацца над становішчам прыгнечаных царызмам народаў Расійскай імперыі.

Блок падтрымліваў сувязі і з салдатамі на перадавой. Так, у адным з пісьмаў ён паведамляе, што ездзіў з візітам да сапёраў і што там было шмат “акопных размоў”. Наглядаўся рост антываенных настрояў. Фронт у той час станавіўся індыкатарам усіх падзей на прыфрантавой паласе. Салдаты праходзілі школу рэвалюцыйнага выхавання. Настроі салдацкай масы ўсе больш перадаваліся паэту і кранаді яго да глыбіні душы. Менавіта ў перыяд знаходжання Аляксандра Блока на Піншчыне канчаткова вызначыліся яго адмоўныя адносіны не толькі да вайны, але і да самадзяржаўнага ладу [16, с. 136].

“...Мы жывём у глушы. Пазіцыя, якую мы рыем і абжываем, цікавая і мнагавёрстая. Рабочых ужо 500 з лішкам. Дзецям пасля вайны будзе цікава гуляць у кулямётных гнёздах... Я азвярэў. Паўдня з канём па лясах, палях і балотах раз’язджаю, амаль непамыты, потым – выпіваем самавары чаю, строчым у канторы. Ва ўсім гэтым многа цікавага, але калі гэта скончыцца, усё пакажацца сном... Жыццё зусім новае, я яго перанашу з лёгкасцю і не без прыемнасці, акрамя часовай нуды. Пісаць пра гэта цяжка,настолькі ўсе іначай, чым у нас.” (Пісьмо да маці з Калбоў. 4.09.1916 г.) [7]. З

ПолесГУ

прыфрантавой паласы пінскага Палесся Блок паслаў шмат цёплых, чуллівых пісьмаў – маці ў Шахматава, жонцы Любові Дзмітрыеўне ў Петраград, вядомай спявачцы Л.А. Дэльмас, якой прысвяціў цыкл вершаў “Кармэн”...Да аднаго з пісьмаў жонцы паэт прыкладвае намаляваную ім карту франтавога раёна. На карце – Парахонск з навакольнай мясцовасцю, тут жа ён адзначае Гомель і Лунінец з чыгункай да Пінска, Лоўча-1 і Лоўча-2, Новы двор, Пагост, Камень, Вулька, рэчкі Ясельда і Бобрык... (мабыць, каб жонцы было лягчэй уявіць, дзе ён знаходзіцца) [2, с. 13].

З цягам часу паэта пераводзяць на службу ў суседнюю з Калбамі вёску Лапаціна, адкуль у апошнія дні верасня ён адбыў у месячны адпачынак у Петраград. 2 лістапада 1916 г. табельшчык 13-й будаўнічай дружыны Аляксандр Блок зноў вярнуўся на ўжо знаёмую яму станцыю Лунінец.

Тут, на Палессі, са спадзяваннямі ў лепшае будучае паэт сустрэў новы 1917 год. Як успамінае саслужывец Аляксандра Блока, у будучым вядомы польскі пісьменнік Уладзіслаў Пршэдпельскі, паэт на Піншчыне не толькі нічога не напісаў, а ўвогуле не хацеў нават размаўляць пра літаратуру і паэзію, лічачы, што для гэтага не тое месца і не той час [16, с.136]. Пацвярджэнне вышэй сказанаму вынікае таксама з успамінаў расійскага паэта А.М. Талстога аб сустрэчы з Аляксандрам Блокам у вёсцы Парахонск: “У студзені 1917 года марознай раніцай я, прыкамандзіраваны Земгорам да генерала М., аб’язджаў з рывізіяй месцы работ Заходняга фронту, вылез з вагона на маленькай станцыі, якая знаходзілася ў заснежаным лесе, і падыйшоў да гарадка фанерных баракаў, дзе знаходзілася кіраўніцтва дружыны. Мне было даручана набыць звесткі аб працуючых у дружыне башкірах. Мяне завялі ў горача натопленую хату. Праз некалькі хвілін прыйшоў загадчык, худы, прыгожы чалавек з румяным ад марозу тварам з заінелымі вейкамі. Усё, што заўгодна, але я ніяк не мог чакаць, што гэты загадчык акопнымі работамі – Аляксандр Блок. Ён радасна павітаўся і тут жа адкрыў канторскія кнігі. Калі звесткі былі адасланыя да генерала, мы пайшлі гуляць. Блок расказваў мне аб тым, як тут слаўна

ПолесГУ

жыць і як ён з дзесятнікаў дaслужыўся да загадчыка, колькі часу ў суткі ён праводзіў на кані; размаўлялі аб вайне, аб цудоўнай зіме… Калі я спытаў – ці што-небудзь ён піша, ён раўнадушна адказаў: “Не, нічога не раблю”[7].

9 сакавіка 1917 г. цар Мікалай II адрокся ад трону. У той жа дзень вечарам Аляксандр Блок паведаміў маці: “Мама, я сабраўся пасля 15-га ў адпачынак і ўбачу цябе... Прырода ўдзельнічае ў тым, што адбываецца, – яна надзвычай яркая і разнастайная. Не папярэджвай нікога наконт майго прыезду ў Пецярбург” [1, с. 89].

Перад ад’ездам Блок працягваў абменьвацца думкамі з У.І. Неміровічам-Данчанкам, які ў МХАЦе рыхтаваў да пастаноўкі яго драму “Роза и Крест”, акрамя таго напісаў некалькі пісьмаў да сяброў і абдумваў змест сваёй паэмы “Возмездие” [11, с. 4].

Такім чынам, 17 сакавіка 1917 г. Блок атрымаў чарговы адпачынак і выехаў у Петраград. Дзякуючы хадатайніцтву сяброў, на фронт паэт больш не вярнуўся, а быў прызначаны рэдактарам надзвычайнай следчай камісіі, арганізаванай Часовым урадам для разгляду спраў былых царскіх міністраў [7].

Знаходжанне Блока на Палессі ў надзвычай цяжкі перыяд Першай сусветнай вайны, ў той ці іншай ступені пасадзейнічала таму, што паэт адрокся ад старых парадкаў самадзяржаўя, глыбей зразумеў неабходнасць “перарабіць усё”, знайсці “правільны шлях”. Хутчэй усяго такія думкі дапамаглі яму стварыць паэмы, якія праслаўлялі магутнасць і сілу рэвалюцыйнага народа. Не выключана, што менавіта на Палессі назапасіўся ў яго той творчы патэнцыял, які праз год выліўся ў знакамітыя паэмы “Двенадцать” і ”Скифы”.

## 3. ПАМЯЦЬ АБ АЛЯКСАНДРУ БЛОКУ ЖЫВЕ НА ПАЛЕССІ

Аляксандр Блок да самай смерці памятаў той час, калі ён жыў і служыў на Палессі, часта ўспамінаў Піншчыну. Паэту падабалася прырода Палесся. “Прырода цудоўная, пісаў ён маці 15 снежня 1916 г., – цяпер мяккі і даволі глыбокі снег і прыгожы месяц”, “Тут цудоўнае паветра, пастаянныя перамены ветру” (1 сакавіка 1917 г.). “Прыемна глядзець у вакно ва ўсе часы. Поле пакрыта глыбокім снегам, ідзе ўверх, на блізкім гарызонце купкі дрэў (соснаў). Гэта тыя пясчаныя ўзгоркі, з якіх летам часам можна бачыць Пінск” (24 лютага 1917 г.) [7].

Успамінаючы сваю службу на Палессі, паэт запіша ў “Дзённіку” 4 верасня 1917 г. наступнае: “Па вечарах часам (як сёння) на мяне находзяць гэтыя грубыя, моцныя, цяжкія і здаровыя ўспаміны аб дружыне – аб людзях, аб конях, папойках, песнях, рабочых, пышнай восені, лютай зіме, балалайках, гітарах... палянках за фальваркам, белым параходзе, які крыштальнай раніцай паўзе сярод гаю, дубах, соснах, вольхах, Пінску ўдалечыні, вёсках, могілках, далях, скачках праз канавы, званіцах, кананадзе, брудным бараку, хаце Лемяшэўскіх, сапёрах, бабах з капустай, вузкакалейцы, мастах – усё, усё. Добра” [4, с. 173].

Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі, слухаючы рэвалюцыйныя гукі ў Петраградзе, паэт успомніць Палессе, Лунінец, станцыю Лоўча і напіша ў дзённіку: “Мяне цікавіць пытанне: учора ў гадзіну ночы я клаўся, слухаючы тыя ж гукі, якія былі чутны, калі я ўпершыню сышоў з цягніка (этапнага) у Лоўчы. І, у гарачы летні дзень: далёкая кананада… Дзе ж заканчваецца гром і дзе пачынаюцца гарматы?”[17,с.161].

Гэта дае ўсе падставы сказаць: з Палессем паэт не раставаўся яшчэ доўга, магчыма, да канца сваіх дзён. У канцы жыцця ён асабліва часта ўспамінаў вёску Калбы, у якой палова жыхароў насіла прозвішча Колб. Блок лічыў, што самім лёсам “зверху” яму была наканавана нейкі час



ПолесГУ

знаходзіцца ў гэтай вёсцы і пакінуць там свой след. Па-першае, таму, што Колб – гэта яго асабістае прозвішча, толькі наадварот. Па-другое, успамінаючы адну з “мілавідных дзяўчын”, што жылі на гарышчы – Марыю Лемяшэўскую ён да апошняга свярджаў, што ў яе ад яго расце сын. Вельмі шкадаваў, што ўжо не давядзецца яго ўбачыць [11, с.137]. Сапраўды, ёсць шмат звестак, што мясцовая дзяўчына Марыя Лемяшэўская (вядома, што яна нарадзілася ва ўсходніх Карпатах пад Драгобычам, рана засталася сіратой і прыехала ў Калбы да сваякоў) нарадзіла ад Блока ў 1917 г. сына, названага Фёдарам.

Як мы ведаем, імя Марыя прагучала ў чарнавіку трэццяга раздзела паэмы “Возмездие”.

Простая девушка пред ним.
Как звать тебя? – Мария.
Откуда родом ты? – С Карпат.

Мария, нежная Мария,
Мне пусто, мне постыло жить!
Я не свершил того,
Того, что должен был свершить.

(А. Блок. Полное собр. соч. Т. 5. С. 72)

Часта Аляксандр Блок у канцы жыцця ўспамінаў каплічку ў Калбах, якую двойчы намаляваў і якая так нагадвала яму царкву ў вёсцы Тараканава ў Падмаскоўі, дзе ён вянчаўся са сваёй будучай жонкай Любоўю Дзмітрыяўнай Мендзялеевай. На яго малюнку мы бачым прыгожую капліцу з двумя крыжамі (над уваходам і на купале), адгарожаную плотам з доўгіх жэрдак. Справа ад увахода – невялікае дрэва, а на пярэднім плане намаляваны гусь. Падрабязна перадана архітэктура капліцы: вялікі васьмерык з ганкам, над ім істотны купал і затым невялічкі васьмерык з малым купалам, увенчаны крыжам.



*Блокаўскі малюнак капліцы ў в. Калбы*

Захавалася і хата Лемяшэўскіх, у якой жыў паэт з таварышамі. Захавалася і мэбля таго часу. Ёсць таксама фатаздымак Аляксандра Блока з таварышамі каля хаты Лемяшэўскіх. Усе ў ваеннай форме. Пасярэдзіне А. Блок, злева ад яго – К. Глінка. Паэт дружалюбна паклаў левую руку на плячо юнага сябра. Трэці – невядомы. Магчыма, гэта начальнік атрада, сям’я якога, як пісаў паэт, “жыла ў Вільні”. Усе трое незвычайна ўзбуджаны, у настроі. На зваротным баку здымка рукой паэта памечана: “вёска Калбы, восень 1916 года”.

Захаваўся магутны дуб, які ў гады Першай сусветнай вайны прыменяўся для прывязкі коней тых вайскоўцаў, што знаходзіліся ў вёсцы Калбы, а гэта значыць, што і сам Блок некалі тут прывязваў свайго скакуна па клічцы “Ураган”.

У вёсках Калбы, Камень і Лапаціна ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі, якія паведамляюць аб былым знаходжанні Аляксандра Блока на Піншчыне падчас Першай сусветнай вайны.

У якасці помнікаў архітэктуры і ў гонар знаходжання Аляксандра Блока на Палессі ўзяты пад ахову дзяржавы сяліба Лемяшэўскіх і капліца ў Калбах, а таксама цэрквы ў Парахонску і Пагосце, якія ён наведваў. Але самай галоўнай установай, прысвечанай памяці Аляксандра Блока на палескай зямлі, з'яўляецца літаратурны музей ў вёсцы Лапаціна, які носіць імя паэта. Ініцыятарам стварэння музея стаў маскоўскі вучоны, журналіст, даследчык жыцця і творчасці Блока Рыгор Блюмін. Ён яшчэ ў 1970-х гадах зацікавіўся і распачаў вывучэнне беларускага перыяду жыцця паэта. З першых крокаў даследаванні Рыгора Блюміна падтрымалі мясцовыя ўлады, творчая інтэлігенцыя раёна. А ў асобе старэйшага музейнага работніка Фёдара Жураўскага з горада Пінска ён знайшоў сабе бескарыслівага прыхільніка і сапраўднага таварыша. Дакладна дзякуючы яму, 2 лістапада 1980 г. (напярэданні 100-гадовага юбілею славутага расійскага паэта) у вёсцы Лапаціна быў адкрыты першы у былым Савецкім Саюзе музей Аляксандра Блока. Не ў Ленінградзе, дзе ён нарадзіўся і жыў, не ў Шахматаве, дзе паэт правёў амаль палову свайго жыцця, а на Беларусі, на Піншчыне, дзе Блок пражыў усяго 7 месяцаў.

У сённяшні час кіраўніком музея з'яўляецца навуковы супрацоўнік Мікалай Жукаў. Дзякуючы старанням і руплівай працы гэтага чалавека музей налічвае звыш 2 тыс. экспанатаў, а колькасць наведвальнікаў дасягнула на працягу года 10 тыс. чалавек. Тут можна азнаёміцца не толькі з экспазіцыяй, але і прагледзець дакументальны фільм, прысвечаны славутаму расійскаму паэту, пачуць запіс жывога голаса Аляксандра Блока, падзівіцца на выставу карцін, якія расказваюць пра жыццё Блока ў дадзенай мясцовасці, а таксама пачуць цудоўныя песні на вершы паэта і аб ім, складзеныя і прапетыя самім кіраўніком музея.

ПолесГУ

Акрамя таго, добрай традыцыяй стала правядзенне свят паэзіі прысвечанных блокаўскім чытанням. Гэтыя святы праводзіліся не толькі ў Лапаціна, але і ў Калбах, Камені, Новым Двары, Парахонску, Лунінцы.

Такім чынам, выказваецца павага і ўдзячнасць паэту, творчасць якога належыць не толькі расійскай літаратуры, але і ўсёй сусветнай культуры. Ведаць і любіць паэзію Блока – гэта значыць яшчэ больш паважаць і любіць сваю родную літаратуру, сваю паэзію, свой народ.






***Мерапрыемствы, прысвечанныя А. Блоку ў вёсках Лапацін, Калбы***




***Блокаўскія мясціны на Палессі***

ПолесГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Зместам дадзенай работы з’яўляецца жыццяпіс дзейнасці расійскага паэта Аляксандра Блока падчас яго знаходжання на палескай зямлі (ліпень 1916 – сакавік 1917).

У выніку даследавання зроблены наступныя высновы:

1. Аляксандр Блок меў тонкую пачуццёва-паэтычную натуру, быў надзелены дарам прадбачання (своеасаблівага адчування будучых падзей). У перадваенны час ніколі не бачачы непраходныя пінскія балоты, ён тым не менш піша некалькі вершаў, што непасрэдна звязаныя з балотнай тэматыкай. На пачатку Першай сусветнай вайны, паэт не сумняваецца, што вайна прынясе не толькі вялікія бедствы для ўсіх грамадскіх слаёў насельніцтва, але і гаспадарчую разруху, палітычны крызіс. У выніку не прымае ўдзел, як пераважная большасць дваранскай інтэлігенцыі, у шавіністычных псеўда-патрыятычных маніфестацыях у падтрымку вайны, і імкнецца пазбегнуць мабілізацыі, фактычна займае пацыфістскую пазіцыю.

2. Аднак у хуткім часе маніфестацыі ў падтрымку вайны змяніліся массавымі незадавальненнямі ў сувязі з паражэннямі на франтах і адпаведна вялікімі людскімі і матэрыяльнымі стратамі. У гэты самы цяжкі для Расійскай імперыі перыяд вайны Блок, апантаны трывожнымі думкамі аб лёсе Радзімы, дае згоду на мабілізацыю ў дзеючую армію. Ён быў залічаны табельшчыкам 13 інжынерна-будаўнічай дружыны Усерасійскага саюзу зямель і гарадоў, якая ўваходзіла ў 3-ю армію Заходняга фронту і знаходзілася ў раёне Пінскіх балот. Дакладна, перыяд знаходжання паэта на беларускіх землях, яго жыццё на Палессі шмат у чым пасадзейнічалі таму, што Блок затым перайшоў да новых, наватарскіх накірункаў паэзіі, якія адпавядалі часу.

3. Нягледзячы на тое, што паэт на Палессі не напісаў ніводнага твора, сцвярджаючы, што для гэтага не наспеў час, усё ж знаходжанне Блока на Палессі ў надзвычай цяжкі перыяд вайны не было марным. Выконваючы самыя розныя службовыя абавязкі ён не забываў і пра літаратурную

ПолесГУ

дзейнасць. Рабіў выпраўленні і карэкціроўку некаторых сваіх ранейшых вершаў, займаўся справамі перавыдання вершаваных зборнікаў, абдумваў напісанне другой часткі паэмы “Возмездие”, рыхтаваў да публікацыі першую частку гэтай паэмы, займаўся пытаннямі пастаноўкі п’есы “Роза и крест”, пісаў шматлікія пісьмы, вёў дзённікі, у якіх рабіў нататкі пра палескую прыроду, ствараў розныя замалёўкі.

4. Менавіта пад уздзеяннем ваенных абставін і знаёмства з простым людам і салдатамі падчас палескага перыяду паэт радыкальна мяняе свой грамадскі светапогляд. Ён канчаткова адракаецца ад старых самадзяржаўных парадкаў, глыбей разумее неабходнасць перамен. А гэта ў хуткім часе прывядзе пасля палескага зацішша ў бурны перыяд творчасці, што выльецца ў напісанне паэм “Двенадцать” і “Скифы”.

5. Аляксандр Блок заўсёды помніў пра палескі край, аб гэтым сведчаць шматлікія яго ўспаміны і запісы, а памяць аб паэце жыве на Палессі. У тых вёсках, дзе ён бываў па абавязку службы, маюцца аб гэтым прымацаваныя шыльдачкі, у шматлікіх населеных пунктах, у тым ліку, ў горадзе Лунінцы ёсць вуліцы, названыя яго імем. У вёсцы Лапаціна працуе літаратурны музей, які носіць імя паэта. Некаторыя будынкі і помнікі прыроды, звязаныя з імем Блока ахоўваюцца дзяржавай. На Піншчыне праходзяць святы яго паэзіі.

ПолесГУ

# ЛІТАРАТУРА

1. Калінковіч, М. Палескія дні Аляксандра Блока / М. Калінковіч.– Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – 111 с.

2. Гришковец, В. Смятенная муза молчала / В. Гришковец // Литературная Россия. – 1994. – № 37 (1649) – 16 сент.

3. Бас, І. Аляксандр Блок на Палессі / І. Бас // Маладосць. – 1958, – № 9 (67).

4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінска. – Мінск : БЕЛТА, 1998. – 557 с.

5. Цуба, М.В. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютоўской рэваюцыі (жнівень 1914 – люты 1917.) / М.В. Цуба. – Матэрыялы да курса “ Гісторыя Беларусі”. – Мінск. – 231 с.

6. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 8938. – Ч. ІІ. – Л. 16.

7. Архіў літаратурнага музея А. Блока ў в.Лапаціна.

8. Кірыковіч,А. Аляксандр Блок і Палессе / А. Кірыковіч // Ленінскі шлях.– 1977. – № 33 (4712) – 17 сак.

9. Калінковіч, М.А. Блок і Лунінеччына / М.А. Калінковіч // Ленінскі шлях. – 1977. – № 33 (4712) – 17 сак.

10. Беларускі Дзяржаўны Архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМ ЛІМ). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 131.– Арк. 9.

11. Шэлехаў, М. Блок на Палессі / М. Шэлехаў // Навіны Палесся.– 1980, – № 141 (4759) – 25 ліст.

12. Цуба, М.В. Палескія пуцявіны Аляксандра Блока падчас Першай сусветнай вайны / М.В. Цуба // Устойчивое развитие экономики : состояние, проблемы, перспективы : материалы III межд. научно-практ. конф. – II часть, г. Пинск, 23–25.04.2009 г. / ПолесГУ; редкол.: К.К. Шебеко [и др.]. – Пинск, 2009. – С. 29–31.

13. Блок, А. Сборник сочинений / А. Блок. – В 6 т. – Т. 6.– Л.,1983. – с. 367.

14. НАРБ. – Ф. 705. – Воп. 1. – Спр. 27. – Л. 109.

15. Блищ, Н.Л. Образ-символ “Болото” в поэтике и жизнетворчестве А. Блока / Н.Л. Блищ. – Социально-

ПолесГУ

экономическое и историко-культурное развитие Полесского региона в XXI веке: материалы международ. науч. – практ. конф. (Пинск, 5–6 мая 2006 г.). – Пинск, КУП “Пинская региональная типография”, 2006. – 230 с.

16. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна.– Минск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.

17. Памяць: Гіст. – дакум. Хроніка Лунінецкага раёна. – Мінск : Беларусь. – 1995. – 716 с.

ПолесГУ

# ДАДАТКІ-ВЕРШЫ, ПРЫСВЕЧАННЫЯ МЕСЦАЗНАХОДЖАННЮ А.А. БЛОКА НА ПАЛЕССІ

## У вянок паэту

Той час далёкі не забыць,
Калі ўначы і ўранак
Стаяла вёсачка Калбы
Пад шапкай саламянай.

А ад Калбоў – падаць рукой,
Увесь у каляінах –
Лапацін з ціхаю ракой,
З нудою камарынай.

Вакол не за адну вярсту –
Балоты, нібы хмары…
Служыў паэт вялікі тут,
Ён тут хадзіў і марыў.

І скіраваўшы ўдалеч зрок,
Дзе лес і птушак вырай,
Вынашваў Аляксандр Блок
Паэму ў сэрцы шчырым…

Затым, бы рынуўшы у бой,
Нібыта гул авацый,
Загрукаталі над зямлёй
Назломаныя “Дванаццаць”.

Паміж турбот і дзённых спраў
Даверліва і шчодра
Людскія душы хваляваў
Ён лірыкай пяшчотнай.

Калі ж займаліся агні
Сузор’яў апаўночы,
Ён Пецярбург свой родны сніў
І мілай Любы вочы…

Ці снег кладзецца на раллю,
Ці льюць дажджы касыя –
Любіце родную зямлю,
Як Блок любіў Расію!

***Зиновий Вагер***

## Блокаўскім мясцінам

Мясціны святыя, што выбраны лёсам,
Калбы і Лапацін, паэзіі ўзнёсак.
Ад песен, ад казак, ад даўніх вытокаў
Гучалі тут вершы вялікага Блока.
Паданні сівыя душой пераняты –



ПолесГУ

Ад люду Палесся, ад кожнае хаты.
І недзе падспутна з рэалій і міфаў
На свет з часам выйдуць славутыя “Скіфы”.
У Бобрыку ціхім любіў Блок купацца,
А зімняй парою – на лес любавацца.
Палесскай прыроды дзівосы кранулі,
І піша ён пісьмы да роднай матулі:
“А снег тут глыбокі, як кінь яго вокам,
І Пінск на далоні, як Кіцеж далекі”.
І цяжка прадставіць палац у Парахонску
З Талстым Аляксеем і свечамі з воску.
І хочацца верыць, што Блок па-суседскі
Тут недзе сустрэўся з Максімам Гарэцкім.
Лічыў сябе Блокам і Колбам таксама,
І прозвішча гэта над вёскай вітала
Блок цуда-капліцы рабіў замалёўкі
Мясцовым дзяўчатам і нават для жонкі.
Каб след свой пакінуць ля хаты вясковай
І ўспомніць сябе ў адзенні вайсковым,
Для фота на памяць на доўгія далі
На прызбе прыселі паэт з сябрукамі.
А побач, ля дуба, на досвітку рана
Карміў Блок з ахвотай каня “Урагана”
І мовіў з усмешкай, адкінуўшы плеці:
“Няма разумнейшай жывелы на свеце”.
Тут недзе знянацку, з прычынаю вескай
Паэт на гарышчы зблудзіў Лямяшэўскіх,
Прыгожыя вочы, прыгожай дзяўчыны
На грэх спакусілі, навек спаланілі.
Забыўшы пра Дэльмас і нават пра жонку
“Марыя, Марыя!..”, – крычаў ён удагонку,
Як хлопец дзяўчыне, як казачнік першы,
Для любай Марыі чытаў свае вершы.
А сёння здалёку з стагодняга часу
Стаяць нашы вёскі – салдаты запасу.
І рэчка, і поле, “як кінь яго вокам”,
І ўсё тут завецца – мясцінамі Блока.
Лапацін сустрэне музеем паэта.
Давайце паедзем у Лапацін за гэта:
Тут ладзяцца святы за вёскай на ўзлессі
І памяць пра Блока жыве на Палессі.

***Міхась Цуба***

## Деревня Колбы

Ах, деревня Колбы, ах, деревня Колбы!
А в деревне Колбы вековые дубы
Отстояли от Блока до этих вот дней,
А один, одинокий, всех прочих сильней,
Распахнулся нешаткий, закрыл белый свет
Над английской лошадкой, что любит поэта.
Август в небе застыл мириадами звёзд.
Помнят Бобрик и Стырь и над Припятью мост,
Как поэт по мосту проносился верхом,
Помолившись кресту, поднимался на холм,
А с холма открывался невидимый град,
Тот, что Китежем звался, и немцем занят.
Ах, деревня Колбы, ах, деревня Колбы!
Не сочтешь до Москвы верстовые столбы.
Но не видно вдали полосатых столбов,
Что когда-то вели от Москвы до Колбов…
Знаю: годы назад тут стоял тот отряд,
В нем – поэт Александр, словно замерший кадр,
По фамилии Блок и по имени Блок –
Сероглазый пророк поэтических строк.
Ах, деревня Колбы – память гордой судьбы,
И часовня, как сон, возле – замерший он.
На планшете – блокнот, карандаш он берет,
И уходит капличка на веки в блокнот.
Александр Александрович, ей поклонясь,
Поспеши: в Парохонске заждался нас князь,
И княгиня-красавица к ужину ждёт…
Но в Колбах он останется встретить восход.
Стырь струится. Встревоженно конь захрапел.
Вам не спится, но это поэтов удел.
А уснете – уйдёте в родной Петроград,
Где Фонтанка и Невский о вас говорят.
Ах, деревня Колбы – память светлой судьбы.
А в деревне Колбы – вековые дубы.
Пусть от Блока до Блока проходят года.
Пусть далеко-далеко уходит беда.

***Георгий Блюмин***

Полесту

# Часовня Блока

В глуши Полесья,
Чаруя око,
Живёт, как песня,
Часовня Блока.

Как лебедь дикий,
Как белый парус…
Ушёл великий,
Она – осталась.

Часовню эту
Полесский зодчий
Отдал поэту
Как символ отчий.

И русский гений
Дар белоруса
Взял без сомнений.
И ввёл в искусство.

“Мой брат по крови,
Мой Колб скуластый,
К тебе с любовью
Пришёл я – здравствуй!

Во мне – кровь предков
С далёкой Эльбы,
В тебе – отметка
Монгольской степи...”

Под вдовьи всхлипы,
Шрапнелей жгучесть
Рождались «Скифы»
В душе могучей.

Чертил на карте
Траншеи, вешки
В полесской хате
У Лемешевских.

России прежней
Трещали стены,
Он неизбежной
Ждал перемены.

В иерихонском
Военном гаме
Над Парохонском
И над Колбами.

И шёл рисунок
Часовни – в Питер,
С войны безумной –
Добра обитель.

Живи в Полесье
И радуй око,
Часовня – песня,
Часовня Блока.

Как лебедь дикий,
Как белый парус…
Ушёл великий,
А песнь – осталась!

***Георгий Блюмин***

Полесгу

*  *  *

Прочтите слово Блок наоборот ─
Немало будет, видно, удивленья,
Наверное, сам Бог в Колбах живёт,
А может, это просто совпаденье.

На свете много сказочных чудес,
Но Блок и Колб не сказка – явь земная:
От их родства в поэзии прогресс –
Звучат который год стихи окрест
О подвигах, о доблести, о славе.

Могучий дуб – свидетель вековой,
Капличка – лучик праведного света,
Похожа на церквушку под Москвой,
Где, как и Блок когда-то молодой,
Венчаются и в наши дни поэты.

Дом Лемешевских, где поэт
Читал стихи в свободную минуту –
Всё это той эпохи атрибуты,
Великого поэта жизни след.

***Николай Жуков***

Полесгу

*Навукова-папулярнае выданне*

**Цуба Міхаіл Віктаравіч**

# ПАЛЕСКІЯ ПУЦЯВІНЫ АЛЯКСАНДРА БЛОКА

Адказны за выпуск *П.Б. Пігаль*

У аўтарскай рэдакцыі

Карэктар *К.М. Міцянок*

Падпісана ў друк 01.02.2018 г. Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Гарнітура «Таймс». Рызаграфія.
Ум.-друк. арк. 2,15. Ул.-выд. арк. 1, 20.
Тыраж 70 экз. Заказ № 488

Надрукавана ў рэдакцыйна-выдавецкім аддзеле
Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта.
225710, г. Пінск, вул. Дняпроўскай флатыліі, 23.

ПолесГУ